Міхась
ПАЗНЯКОЎ

# Ехаў поўны воз дзівос



Міхась
ПАЗНЯКОЎ

# ЕХАЎ ПОЎНЫ ВОЗ ДЗІВОС

**ВЕРШЫ, СМЯШЫНКІ, ЛІЧЫЛКІ, НЕБЫЛІЦЫ, СКОРАГАВОРКІ, ЗАГАДКІ**



Мінск
«Юнацтва»
1994

ББК 84 Бел 7
П 47
УДК 882.6-93

Мастак
В.А. МАКАРАНКА

*Для малодшага школьнага ўзросту*

Новая книга поэта состоит из нескольких разделов. В первом представлены стихи на самые разные темы нашей действительности. Во втором разделе — смешинки, считалки, небылицы. В третий раздел вошли скороговорки. Очень заинтересует юных читателей и четвертый раздел книги. Здесь собраны загадки.

П $\frac{4803120205-069}{М\ 307(03)-94}$ 70—93

ISBN 5-7880-0878-6

© М. П. Пазнякоў, 1994
© Афармленне.
В. А. Макаранка, 1994



# У родным краі

ВЕРШЫ





## СКАРЫНА

Асветнік, вучоны
І першадрукар,
Наш гонар —
Францішак Скарына.
Запомні ўсім сэрцам
Як велічны дар
Радзімы
Славутага сына.

Праклаў ён дарогу
Да Слова, Святла,
За Матчыну Мову
Паклікаў змагацца,
Каб вольнай заўсёды
Між вольных магла
Дзяржаваю
Белая Русь
Называцца.

# МАЛЮНАК

Я намалюю хату, сад,
І жаўрука, што ў бомы звоніць,
І ліпы, што пасталі ў рад,
І ў агародчыку півоні.

Сцяжынку, рэчку між кустоў.
Валун агромністы...
Магчыма,
Камусьці гэта і нішто,
А мне навек —
Мая радзіма.



# Я ПРЫЕДУ

Прыеду я абавязкова
У той любімы мой куток,
Дзе першае прамовіў слова,
Дзе я зрабіў свой першы крок.

Прыеду, каб адчуць душою,
Як веюць водарам лугі,
Аб чым шапоча над ракою
Лес, сябар мой найдарагі.

І басанож прайду сцяжынай,
Дзе па брыльянтах спелых рос
З сябрамі бегаў у ажыны
І слухаў музыку бяроз.

Я роднай вёсцы пакланюся,
Зямлі прыгожай, маладой
І землякам — руплівым людзям,
Адданы ім усёй душой.

Там шум житоў і квецень бульбы,
Блакітам цёплым лён цвіце...
З усіх дарог я, край мой любы,
Заўжды вярнуся да цябе.





## МАТЧЫНА ЛЮБОЎ

На падворку — завіруха,
Свішча вецер ледзяны.
Казку ўважліва ты слухаў,
А цяпер, сынок, засні.

Верабейкі ўжо паснулі
Пад зацішнаю страхой,
Засынай і ты, сынуля,
Залаты званочак мой.

Будзеш ты ў мяне заўсёды
Добрым, шчырым, як цяпер,
Адганю я ўсе нягоды,
Мой сыночак, ад цябе.

Дзеці ўсюды вырастаюць,
Каб жыццё квітнела зноў.
Ведай: самая святая
Гэта — матчына любоў.

Маці светлым, чыстым сэрцам
Прад табой асветліць змрок.
А надарыцца — ад смерці
Захіне сабой, сынок.

## ПОМНІК ГЕРОЮ

Герою з Масквы ці з-за Дона,
Майму земляку ці з-за Волгі
Пад юным зажураным клёнам
Стаіць абеліск ля дарогі.
Далёка ад роднага краю
Сцяжыну яго абарвала
Тупая варожая куля.
Хавала яго не матуля.
Салют не грымеў над грудком —
Хавалі салдата цішком
Уночы жанчыны-сялянкі
На мужнай зямлі партызанскай.

Не быў ён знаёмы нікому,
Застаўся таму невядомы.
У Дзень Перамогі пагожы
Абнеслі грудок агароджай.
Чырвоная гордая зорка
Заззяла над сумным пагоркам.
Удовы з адноўленай вёскі
Пасеялі побач валошкі,
Маленькую лаўку зрабілі
І клён малады пасадзілі.

Расце ён, салдату спявае
Пра маці, што дома чакае.





## МАТУЛЯ

Сонца пачынае
Летні дзень,
Нібы мама
Да мяне ідзе.

Цеплынёй усмешкі
Саграе,
Рукі мне
Працягвае свае.

— Замарыўся,— кажа,—
Мой сынок.
Адпачні ля мамы,
Галубок.

Прытулюся
Да матулі я:
— Як з табою добра,
Любая мая!

...Мільгануў
І гасне
Летні дзень.
— Ты куды,
Матуля?
Дзе ты? Дзе?..

## ДАМОК ДЛЯ РЭКСА

З татам
Дзень мы працавалі,
Дошкі разам
Габлявалі,
Размяралі,
Пілавалі,
Шмат цвікоў
Мы забівалі
І дамок
Сабаку Рэксу
Найпрыгожы
Збудавалі.

Ёсць балкон,
Акно ў дамку,
Ёсць канапка
У кутку.

Над дзвярыма
Ёсць званок,
На падлозе —
Дыванок.

І цяпер
Мяне са школы
Сустракае Рэкс —
Вясёлы.



## КАЗКІ



Чытайце казкі,
Бо няма
У іх хлусні
Нікольк.
Чытайце казкі,
Бо яны
Нясуць нам
Радасць толькі.
Святлом і шчырасцю
Заўжды
Напоўняць нашы сэрцы.
Чытайце казкі
І ў дабро
Заўсёды,
Дзеці, верце.

## У ВЫХАДНЫ

Тата наш мые бялізну,
Мама гатуе абед,
Сёстры, Наташа і Ліза,
Ў зале шчыруюць як след.

Глеб прыбірае ў дзіцячым,
У калідоры — Пятрок.
Спальню прыбраўшы, мы з Кацяй
Складваем цацкі ў куток.

Дружна сям'я ўся працуе,
Потым абедае ўсмак
І на прагулку кіруе
З добрым настроем у парк.

## МОЙ БУСЛІК

Буслік мой адлятае
На зіму ў цёплы край.
Я рукою махаю:
Адлятай, адлятай.

Шлях няблізкі, няпросты.
Не адстань ад сяброў,
Смела крылы выпроствай,
Будзь здароў!
Будзь здароў!

А дарогу асіліш,
Тэлеграму прышлі,
Як дабраўся, мой мілы,
Да паўднёвай зямлі.



## РАДЗІМА

Хата між клёнаў.
Сад за сцяной.
Коўдрай зялёнай
Луг за ракой.

Зводдаля — жыта,
За жытам — хмызняк.
Проста нібыта,
Ды люба ўсё як!

## У ЗААПАРКУ



Тыгрыца
Лашчыць тыграняці.
Хоць злая,
Страшная,
А маці.
Ёй вельмі рада
Тыграня,
Таму ім
Усміхнуўся я.

## ПАЎЛІН

І дарослых і дзяцей —
Здзівіць цэлы свет,
Бо заўсёды на хвасце
Носіць ён букет.



## НАСАРОГ

Не кабан,
Не бегемот,
У яго
Шырокі рот.
І не нос —
Вялікі рог,
Ох, і страшны
Насарог.
— Добра, што ён
У вальеры,—
Шэпча Паўліку
Валера.

## ВЯРБЛЮД

— Ой, які ён
Непрыгожы,—
Кажа здзіўлены Сярожа.—
І гарбаты —
Жах і цуд!
Нездарма
Завуць — вярблюд.
Ну, а важнасці,
Бы ён —
Алімпійскі чэмпіён.

Плюнуў хлопчык:
— На няўклюду
Болей я
Глядзець не буду.
А вярблюд,
Нібы варожа,
Гэтак фыркнуў
На Сярожу,
Што Сярожаў чуб
Імгненна
Быў пакрыты
Белай пенай.
І глядзіць вярблюд,
Бы кпіць:
«Трэба выхаваным быць».

## БЯГУН

Шпаркі заяц
Лугавінай
Коціцца,
Бы той клубок,
Бегуном
Ён стане
Слынным:
Трэніруе зайца...
Воўк.



## ХІТРЫ ТКАЧ

Мухам хваліцца павук:
— Я наткаў паркалю,
На работу здатных рук
Глянуць запрашаю.

У куточку ён вісіць,
Дружна паспяшайце.
Каб паркаль мой ацаніць —
На яго сядайце.

## ГАЛКА І ГАЛЧАНЯТЫ

Галчанят вучыла галка
Лётаць смела, лётаць шпарка
І, паказваючы — як,
Гаварыла птушкам так:

— Паглядзіце, вунь спакойна
Самалёт ляціць шматтонны,
Хутка, роўна — вышыні
Не баіцца ён ані.

І вавёрка — крыл не мае,
А між дрэў заўжды лятае.
Нават воблакі лятуць,
Хоць не птушкі анічуць.



Ах, маленькія пястушкі,
Ці ж баяцца неба птушкі?
Сорамна вачам маім,
Раз, два, тры —
Ляцім! Ляцім!

## ЛІСА І КУРАЧКА

Ліска курачку прасіла,
Каб яна гуляць хадзіла,
Каб далёка ад сяла
Палахлівай не была.

Каб ішла гуляць без спросу,
Абяцала курцы проса,
Быць сяброўкай назаўжды,
Выручаць яе з бяды...

Курка з ліскаю пайшла,
Ліска ў лес яе звяла.
Зразумелі вы без слоў:
Не вярнуцца ёй дамоў.



# ЛЯНІВЫ ЁРШ

Сеў ля возера рыбак
І закінуў вуду:
— Лінь, карась,
Пячкур, шчупак,
Плотка, ёрш,
Мянтуз і рак,
Я карміць вас буду.
Вы не бойцеся кручка —
Паспытайце чарвячка.
У траву зашыўся лінь,
Рак, карась —
Услед за ім.
Хітрыя пячкур, мянтуз,
І шчупак, і плотка
Пад густы лазовы куст
Шуснулі таропка.
Толькі ёрш быў рад —
Лайдак,
Стаў вакол круціцца:
«Гэткі тлусценькі чарвяк —
Варта пажывіцца».
Прагна ён раскрыў раток —
І патрапіў на кручок.



## ЗЯЗЮЛЯ

Голас жаласны ў зязюлі:
— Дайце проса для сынулі
І крынічнае вадзіцы
Дайце роднаму напіцца.

— А ці ж помніш ты, зязюля,
Дзе маленькі твой сынуля?
Не прасі, шукай сама:
У цябе сынка няма.

Ты ж гняздзечка не будуеш
І дзіцятак не гадуеш,
Век падкідваеш яечкі
У чужыя ты гняздзечкі.

## ЖАРАБЯ

Жарабя маё малое,
Добры, слаўны прыгажун,
Пагуляй, пабудзь са мною.
Хочаш — казку раскажу?

Пачастую смачным хлебам,
Напаю жывой вадой
І штодзённа буду летам
Забаўляцца я з табой.

Набярэшся звонкай сілы,
І аднойчы ўдалячынь,
Быстраногі дружа мілы,
Мы з табою паімчым.

## ХВАРАВІТЫ ЯНОТ

У лянівага Янота
Вельмі цяжкая работа:
На градзе сабраць суніцы
Для сябе і для сястрыцы.

На канапу лёг Янот:
— У мяне баліць жывот,
Не магу я працаваць,
Трэба, мабыць, паляжаць.

Маці войкае: — Ой! Ой!
Што, сынулечка, з табой?
— Дрэнна мне, жывот баліць,
Пэўна, хоча ён суніц.

Маці ягад назбірала —
І Яноту добра стала.
Перастаў балець жывот,
Зноў гуляць пабег Янот.

Клікне маці на работу —
Нездаровіцца Яноту.
У яго жывот баліць,
На канапе зноў ляжыць.

Падкажыце: як Яноту
Вылечыць ляноту?

## У МАГАЗІНЕ

— Што табе купіць, Галіна?
Можа, ляльку?
Піяніна?

Можа, мячык? Посуд?
Кніжку?
Чабурашку?
Зайку? Мішку?

Ты чаму маўчыш,
Дачушка?
Выбірай,
Мая пястушка.

Можа, слоніка?
Лісічку?
— Мама, я хачу...
Сястрычку.



## ДАЗОР

Узляцелі ў неба
Самалёты —
Баявы паветраны
Дазор.
У кабінах
Мужныя пілоты
Неба праслухоўваюць
Да зор.

## ГРЭХ

Чалавека
Ні за што
Зняважыць —
Гэта
Не якісьці там
Агрэх.
Не памылка нават
(Я хачу заўважыць)
Тут, а грэх.

## ТЫРАДЫ



Дзень нараджэння
Сёння твой,
І ты —
Нібы які герой:
Цябе ўсе хваляць,
І ты рад.
Але не стань жа
Ганарлівым
Ад тырад.

## ПРА ПРАКОСЫ І ПРА КОСЫ

Тры касцы
Вядуць пракосы,
Напяваючы пра косы:
— Косы, косы-працаўніцы,
Покуль ёсць раса — касіце.
Ападзе раса далоў,
Пойдзем, косанькі,
Дамоў.

## ВЫХВАЛЯКІ

Выхваляліся трытоны:
— Мы па дне ракі паўзём,
На сабе вады тры тоны
Нават хоць бы што нясём.

## ХТО ШТО АБО ДЗЕ
## І ЧЫМ ЗАПРАЎЛЯЕ

Пад хусцінку для красы
Таня запраўляе валасы.

Малайчына наш Сярожа —
Запраўляе сам ён ложак.

Мама суп мне налівае
І смятанай запраўляе.

Ураджай каб быў,
вясной,
Каб расло усё як трэба,
Запраўляе тата мой
Угнаенні добра ў глебу.

На заправачнай «Масквіч»
Запраўляе Клім Фаміч.

Ганарыцца Каця працай
На камвольным камбінаце:
Запраўляе там бабіны
У прадзільныя машыны.

Запраўляе ў клубе Міла —
Драмгурток яна стварыла.

## ПРА ІМЁНЫ

Хваліць мама Ліпу,
Бо яна ля хаты
Пасадзіла ліпу.

Ловіць рыбу Карп —
Будзе на абед
Вельмі смачны карп.

Для сястры Галінкі
Адламаў я ў садзе
Бэзу тры галінкі.

У кватэры — ціша,
Новай, добрай кнігай
Захапіўся Ціша.

Быў у цырку Леў,
Спадабаўся хлопцу
На арэне леў.

Мы зайздросцім Глебу —
Ён півоні сёння
Пасадзіў у глебу.

Пэўна, карту свету
Аніхто не знае
Лепш за нашу Свету.

Не шукайце Пашу —
Статак разам з татам
Ён пагнаў на пашу.

Для сястрычкі Полі
Васількоў букецік
Я нарваў у полі.

Праца, клопат — веру,
Анідзе, ніколі
Не збянтэжаць Веру.

Доўга спала Соня,
Не зрабіла ўрокі,—
Ой, якая соня!

У Яніны ў жніўні,
А ў сяброўкі Маі
Імяніны ў маі.

Вова — з Магілёва,
А суседка Рыма
Прыляцела з Рыма.

З саду мне
Прынёс Антон
Сакаўны антон.

Праз узгорак
Дзед Пракоп
Пракапаў пракоп.

Аграном — Любоў,
Памагла дзяўчыне
Да зямлі любоў.

Ад дамашняй працы
І вучобы ў Томы
Не бывае ўтомы.

Не забыць век Нілу,
Як на яхце ён плыў
Па шырокім Нілу.

Любіць спорт Надзея,
Чэмпіёнкай стаць —
У яе надзея.

Папрасіў я Вару:
— Ты налі мне вару,
Цукру дай і мяты,
Хочацца гарбаты.

Глеб прыйшоў да Сані,
Той залез у сані:
— Запрагай, сябрук, каня,
Сёння ў лес паеду я.

На футболцы
У Марата —
Нумар пяты.
Ну, а ў Сёмы —
Нумар сёмы.

Плаваць я вучуся ў Тоні —
Не патоне
Тоня ў тоні.

## КОТ І МЫШКА

Кот увішны
Ля нары
Лёг, хітрун,

На сонцы грэцца.
Кліча мышку:
— Ты вылазь,
Хопіць побач месца.

Толькі мышка
У адказ:
— Не чакай, Васятка,
Бо не холадна якраз
Мне і мышаняткам.

І не кліч мяне
З нары,
Не пільнуй —
Дарэмна.
У мяне, Васятка,
Ёсць
Шмат хадоў
Падземных.



## МАРОЗ

І мастак, і чараўнік,
І дзівосны працаўнік.
Без машын масты кладзе
Ён зімою па вадзе.

Размалюе серабром
Рэчку, вуліцу і дом.
І раскіне нам каткі —
Аж звіняць на іх канькі.

Чым, скажыце, не дружбак
Чараўнік наш і мастак?

# СНЕГАВІК

Хоць на вуліцы — мароз,
Шум вясёлы ля бяроз.
Цёпла сэрцам і рукам —
Лепім мы снегавіка.

Хто качае ў глыбы снег,
Хто па моркву-нос пабег.
Кацялок прынёс Сяргей,
Прыцягнуў мятлу Андрэй.

Іра — два вугольчыкі,
Ёй удзячны хлопчыкі.
Хутка снег ля хаты знік,
Ды падняўся снегавік.

Добры, радасны,
І мы —
Рады першым дням зімы.
Аж вароны на страсе
Анямелі з дзіва ўсе.



## ЗАВІРУХА

Як ваўчыца злая,
Вые ў полі глуха,
Сцежкі замятае
Снегам завіруха.

Сцелецца пад ногі
Белаю лісіцай
Гэтак, што з дарогі
Кожны можа збіцца.

Не зманіць нас хіжай,
Ляжа адсыпацца —
У лясок на лыжах
Пабяжым катацца.



## ПРАДВЕСНЕ

Знікнуць сумныя завеі,
Злягуць злыя маразы.
Цёплай ласкаю павее
На палеткі і лясы.

І каб весела над намі
Сонца сыпала красу,
Зазвініць жаўрук ключамі,
Адмыкаючы вясну.

## КРАСАВІЦКІ ДЗЕНЬ

Сонца апоўдні прыгрэла,
Хутка знік ранішні снег.
Дзеці чапляюць арэлі,
Чуецца радасны смех.

Чыстае, яснае неба,
Хмаркі нідзе не відаць.
Жоўтыя пахкія вербы
Цёплай пяшчотай звіняць.

Хваліцца шпак галасісты —
Новай шпакоўні ён рад,
Ветлым сярэбраным свістам
Поўніцца ўзрушаны сад.

Хочуць пупышкі шчасліва
Крыкнуць: «Жыццё сустракай!»
Коціць званочкі гулліва
За агародам ручай.

І як часцінка прыроды,
Сам я спяваю, цвіту.
Лепшай няма асалоды,
Чым адчуваць дабрату.

## ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?

Зноўку бэз цвіце ля хаты.
Сонца. Весела. Вясна.
І сваю суседку Нату
Я выглядваю з акна.

Мабыць, здарылася штосьці
Вельмі радаснае з ёй —
Ад вясновай прыгажосці
Стала дзіўнаю такой.

У аранжавай сукенцы,
Банцік белы, нібы снег.
Скача ў класікі, смяецца,
І такі прыемны смех.

Не пайшоў у лес я з татам,
Дома хораша вясной.
Штосьці здарылася з Натай,
Штосьці робіцца са мной.

## ЛАНДЫШ

Ландыш, ландыш,
Расцвітай.
Прыгажосцю
Вечнай
Захапляй.
У лясной
Духмянай цішыні
Белымі званочкамі
Звіні.

## ПАСАДЗІЛІ САД

Таня, Галя, Клім, Рыгорка,
Валя, Міша і Ягорка
Ад аўторка да аўторка
Шчыравалі ля пагорка:
Пасадзілі новы сад —
Кожны добрай справе рад.



## ШКАДЛІВАЯ МУРКА

На клён да шпакоўні
Забралася Мурка,
Але не чакала,
Што шпак-вартаўнік
У садзе падыме
Настойлівы, гулкі
На госця нязванага
Крык:

— Куды ты крадзешся,
Чужая тут хата!
Я ведаю добра
Намеры твае.
У школу пайсці
Табе восенню варта,
Бо добрых паводзін
Якраз не стае.



## РОДНЫ КУТ

Мой родны кут!
Як любы тут
Прастор палёў
І мяккі водар
Садавіны!
Паеду —
Сніцца зноў і зноў,
Прыеду —
Ён найшчыры,
Найгасцінны.

## ІРЫНКА

Мне падабаецца дзяўчынка
З крынічным іменем Ірынка.
Яна прыгожая такая,
Каса ў Ірынкі залатая,
А вочы, нібы васількі,
І голас ветлівы такі.
Яе я ўбачыў першы раз,
Калі прыйшоў у першы клас.
Я побач з Іркаю вясёлы,
Але сумую пасля школы.
У гэтым сябруку прызнаўся,
А ён нядобра рассмяяўся.
Цяпер і ў школе я, і дома
Пра Ірку не кажу нікому.
І нават маме па сакрэту
Я не адкрыю тайну гэту.
Хай лічыць лепш, што я стаміўся
Ці, можа, з сябрам пасварыўся.

А хутка ў Іркі будзе свята,
Хай смехам пырскае сябрук,
А я, як робіць маме тата,
Ірынцы кветкі падару.
Нікому крыўдзіць не дазволю
Яе на вуліцы і ў школе.

## ПЛІСКА

Крычыць трывожна
Пліска ля ракі:
«Шукаць маё гняздо
Ты кінь! Ты кінь!»

Даруй трывогу,
Пліска.
Я іду
Да рэчкі
Па крынічную ваду.

## ШЫПШЫНА

У палісадніку шыпшына,
Як сарамлівая дзяўчына,
Прыгожым кветам расцвіла —
Зачаравала паўсяла.

## БЯРОЗА

Ля весніц бяроза
Расла, чаравала...
І вось нечакана
Бярозы не стала.

Шпакі замаўчалі,
Няўтульна ля хаты.
І вецер сваволіць,
І двор стаў шчарбаты...

Бяроза — старая,
Яшчэ (памаўчу) —
На двор
Замінала
Прайсці «Масквічу».

І гэтак самотна,
Бы сябар загінуў...
Я з крыўдай балючай
Гляджу на машыну...

## ТРАВЫ

На сцяжыне палявой
Твар у твар
Сяджу з травой.
Разглядаю асцярожна
Крапіву і падарожнік.

Як растуць, жывуць —
Цікава.
Вось трымцяць званочкі справа,
Мёдам пахне канюшына,
Вось асот узнёсся чынна.

Вось рамонак прамяністы,
У пялёстках белых, чыстых,
З сонечнай усмешкай
Мне шапоча нешта.

Вось свірэпка — каралева.
Васількі сінеюць злева —
Родныя, жаданыя,
Нібы вочы маміны.

## КОЛЬКІ КВЕТАК?

Зацвілі на лузе
Сонечныя кветкі.
Колькі іх? —
Скажыце,
Падлічыце, дзеткі.

Адказалі дзеці:
— Цяжкая работа.
— Гэта немагчыма.
— Брацца неахвота.

Усміхнуўся хітра
Мой сусед Мікола:
— Лепей запытацца
У руплівых пчолак.

## ГРАДА

Што —
Правер ты —
На градзе
З літараю «р»
Расце?

Пад зялёным
Пахкім кропам
Разлягліся агуркі,
Ёсць радыс,
Пятрушка,
Морква,
Рэпа,
Рэдзька,
Буракі.

І гарох,
І памідоры,
Сельдэрэй,
І гарбузы,
І цыбуля,
І фасоля.
Што не так тут? —
Адкажы.



## У ВЁСЦЫ

Па-над вёскай сее зоры
Месяц звонкі, малады.
Сінь запоўніла прасторы,
Веюць водарам сады.

Дрэвы мройліва шапочуць,
Бусел у гняздзе не спіць...
Колькі ў сэрца летняй ноччу
Наплывае таямніц!

## СЕНАКОСНАЯ ПАРА

Касавіца!
Пахнуць травы...
Сена свежае грабём,
Вецярок, сухі, ласкавы,
Падсалоджаны мядком.

Сонца ў небе — караваем.
Сінь бяздонная наўкруг.
Да ракі нас запрашае
Па сцяжыне звонкі луг.

А з кустоў лазы няспынна
Клічуць пліскі адпачыць,
Вабяць пахкія маліны
Смагу сокам наталіць.



## СНЫ З МАЛЕНСТВА

У бары майго дзяцінства
Льецца птушак звонкі грай.
Дыхай водарам смалістым
І душою спачывай.

Сонца грэбенем чароўным
Чэша соснам кудзяркі.
Там, духмяныя, спакойна
Спачываюць вецяркі.

Там маліна аж іскрыцца
І арэхі — смаката.
Скачуць жвавыя куніцы
І вавёркі ў промнях там.

Шапацяць таемна крокі
Ад рабінавай зары:
Ходзіць хлопчык яснавокі
У блакітным тым бары.

Убірае ў сэрца гамы,
Фарбы, пахі, цішыню...
Прыязджаю я да мамы
І яго штоночы сню.

## ЛЕПШЫ ГРЫБНІК

Я ў лес прыходзіў сябрам,
Галінак не ламаў.
Быў рады гукам, фарбам,
Хадзіў, запамінаў.

Глядзеў, замілаваны,
На дрэвы, верасы,
І лес адкрыў мне тайны
Сваёй жывой красы.

Я ведаю, дзе кветкі,
Дзе ёсць баравікі,
Таму штораз мне ўлетку
Зайздросцяць грыбнікі.



## АДКРЫЦЦЁ

Я мацярык адкрыць
Жадаў,
Так, як Калумб
Амерыку.
Пра гэта
Брату расказаў —
Камбайнеру Валерыку.
І ён з сабой
Узяў мяне
У поле, дзе жыты
Без краю.
І я глядзеў вакол,
Бы ў сне,
Не разумеючы яшчэ,
Што я радзіму
Адкрываю.

## КЛІЧА САД

Звонкім, сакавітым летам
Кліча нас у госці сад.
Смачным сонечным ранетам
Частаваць усіх ён рад,
Хто лісцё зграбаў старое,
Дрэвы дбайна вапнаваў,
І абкопваў іх вясною,
І шпакоўні майстраваў.

## ЗАПРАШАЮ

Я на дачы працаваў:
І палоў, і паліваў.
А сягоння запрашаю
Вас на свята
Ураджаю.

Гэткай вырасла цыбуля —
Пазайздросціла бабуля.
І гарох, і боб —
На дзіва!
Рэпа слаўная ўрадзіла.

А якія агуркі!
Я не еў яшчэ такіх.
Морква — растае
У роце.
Пачастую ўсіх —
Прыходзьце!

## ЛЯСНАЯ ПРАЦАЎНІЦА

Прачынаецца вавёрка,
Новы кошык дастае
І ляціць між соснаў гонкіх —
Шмат работы
У яе,
Бо паспелі ўжо арэхі
І грыбы пайшлі якраз.
Трэба ёй паспець па меху
Насушыць іх у запас.

Замятуць зімой завеі
Золкім снегам край лясны,
А вавёрка чай сагрэе,
Зварыць смачны
Суп грыбны.
Торт арэхавы згатуе,
Клікне птушак да сябе.
Завітаеш — пачастуе
Вельмі смачна і цябе.

## ЖУРАВЫ

У небе халодным
За гай, паплавы
Над берагам родным
Лятуць журавы.

І клічуць, здаецца:
«За намі хутчэй!»
І жоравам сэрца
Ірвецца з грудзей.

Ды што вам рабіць там,
У краі чужым?
І чую нібыта:
«Вясной прыляцім».

Не ведайце стомы!
Шчасліва крыляць!
Вяртайцеся, дома
Вас буду чакаць.





## ПТУШЫНАЕ СВЯТА

— Чык-чырык,
Чырык-чыр-чыр,—
Шум вясёлы
На ўсю шыр.
На ружовістай рабіне
Цэлы дзень
Канцэрт птушыны.
Вераб'і і снегіры
Сёння тут —
Гаспадары.
Госці —
Каралькі, сініцы —
Рады з імі весяліцца.
Дружна ягады дзяўбуць,
Песні звонкія пяюць.
Прылятай і ты, сарока,
Не глядзі самотна збоку.



# Куранят вядзе авечка

**СМЯШЫНКІ,
ЛІЧЫЛКІ,
НЕБЫЛІЦЫ**

## ЖЭНЯ І КІШЭНЯ




— Разважае адмыслова,
Гаваркі — унучак Жэня.
І ні разу
Ён па слова,
Бач, не лазіць
У кішэню,—
Кажа гэтак
Наш дзядуля.
І за братам
Дзень сачу я:
Мне б даведацца —
У Жэні
Колькі слоў ёсць
У кішэні?

## ВОСТРЫ ЯЗЫК

Дзед падняў у хаце крык,
Вы яшчэ не чулі? —
Востры, нібы нож, язык
У маёй бабулі.

Дзед злуе, а я цішком
Ля яго бядую:
Ой, парэжа языком
Рот сабе бабуля.

## ШТО НА НОСЕ?

Мой дзед Антось
Кляпае косы
І кажа мне:
— Касьба на носе.

А я гляджу
На дзедаў нос —
Жартуе, мабыць,
Дзед Антось.

## ШТО ГАРЫЦЬ?

— Ну і Віця! —
Дзед бурчыць.—
Бач, на ім усё гарыць...
Я гляджу
І ледзь не плачу.
Ды ніяк
Агню не ўбачу.
Віця ж — брат
Старэйшы мой,
Абалью яго вадой.

## ЦІ ЗНОЙДЗЕ?

Дзед пад вечар кажа бабцы:
— Галаву Сяргей згубіў,
У суседні клуб на танцы
Зноў сягоння пакаціў.
Бабка дзеду адказала:
— Ты ж і сам губляў яе...
Ну, а мне аж дрэнна стала:
«Галаву знайдзі, Сяргей!»

## ПЕРАСТРАХАВАЎСЯ

— Навошта ты, Антось,
Паклаў на лоб кампрэс? —
Спытаўся дома ў брата
Старэйшага
Алесь.

— Мо доктара паклікаць?
— Я так...—
Сказаў Антось.—
Са сходу мама прыйдзе
Бацькоўскага
Вось-вось.

## ЛЯ КАРТЫ

— Пакажы мне, Каця, Львоў...
Кіеў... Віцебск... Кішынёў...
А цяпер —
Арол дзе, Каця?
— Птушак жа...
Няма на карце...

## ПРЫЧЫНА

— Чаму са школы
Гэтак рана
Прыйшоў ты, Лёня?

— Я на гадзіннік,
Тата, глянуць
Забыўся сёння.

## СТРАШНЫ ДЗЁННІК

Бацька сшыткі праглядае
І ў Віталіка пытае:
— Дзённік ты чаму сягоння
Не прынёс, сынок, дамоў?
— Васілю аддаў я дзённік,
Напалохаць ім бацькоў.

## ВЕДАЕ КОТ

— Тата,— сын пытае,— мышы
Шмат жывуць? А колькі год?
— Адказаць нам зможа, Міша,
На пытанне гэта кот.

## КАБ НЕ ПАСТАРЭЦЬ

— Ты не ведаеш нічога,—
Кажа дзед Андрэю.
— Дзед, а буду ведаць многа,
Рана пастарэю.



## ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ

Дзень — лагодны,
Цёплы, яркі.
У блакіце —
Ані хмаркі.

Мы сабраліся
Гуляць,
Весяліцца,
Сябраваць.

Куст чаромхі
Зацвітае.
Песняй нас
Жаўрук вітае.

Шпак спявае
На вярбе.
Зараз жмурыцца —
Табе!

## У ГРЫБАХ

У грыбы пайшлі сябры,
Шмат дарункаў у бары.
На палянцы сябрукоў
Сустракаў гурток грыбоў:

Падабабак, махавік,
Сыраежка, баравік,
Падасінавік — фарсун,
Рыжык — рэдкі прыгажун,

І лісічка, і казляк,
І духмяны грузд-бяляк.
Адкажы хутчэй, не баўся,
Грыб табе
Які дастаўся?

## ШЧОДРЫ ПЕЎНІК

Ехаў Пеўнік наш
З базару,
Вёз дадому
Воз тавару.

Тым, каго ён
Сустракаў,
Падарункі
Раздаваў.



Коціку — шкарпэткі,
Курачцы — сурвэткі,
Вожыку — талеркі,
Зайчыку — цукеркі,

А Сабачку — парасон,
Каб у дождж
Сухім быў ён.

Мышцы —
Торбу сухароў,
Вераб'ю —
Букет шароў.

Глянуў дома —
Воз пусты.
Выйшлі ўсе,
Застаўся ты!

## ЛІСІНЫ ГРАБЯНЁК

Каля вёскі блізка
Прабягала ліска,
Бегла з поля
У гаёк
І згубіла
Грабянёк.

Дзеці крочылі
Ў маліны,
Грабянёк знайшлі
Лісіны.
І аднеслі да нары
У задумлівым бары.

Ліска ўдзячная была,
Браць маліны
Памагла.
Грабянёк
На пні ляжыць.
Хто не быў —
Таму вадзіць.

## ПРАЦАЛЮБЫ

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшлі дзеці працаваць.

Лаўку Глеб пафарбаваў,
Клумбу Ігар ускапаў.
Віця ліпку пасадзіў,
Пеця дом шпакам зрабіў.

Света гусак пакарміла,
Жэня ганачак памыла.
Падмяла дарожкі Оля —
Стала хораша наўкола.

## КАНЦЭРТ

Звон звініць
На цэлы свет:
На двары
Ідзе канцэрт.

На трубе
Іграе крот,
На гітарах —
Бык і кот.
Побач
Шэранькі кабан
Б'е лычом
У барабан.

Мыш
Спявае ў мікрафон.
Ты не верыш? —
Выйдзі вон!



## КУРАНЯТ ВЯДЗЕ АВЕЧКА

Селі акуні на плот.
На рамонку
Кот ляжыць.
У кустах спявае крот,
У шпакоўні
Вожык спіць.

Вусень воз цяжкі вязе,
Свінка села
У гняздзечка.
Па галінцы конь паўзе,
Куранят вядзе авечка.

## БЫВАЕ Ж ТАКОЕ!

У вадзе жывуць ваверкі,
У дупле жывуць бабры.
Совы — ў возеры глыбокім,
А самы — ў густым бары.

Пчолы спяць зіму ў бярлозе,
А мядзведзі — у вуллі.
Конь спявае на бярозе,
Вераб'я ў плуг запраглі.

## ПЕРАПАЛОХ

Карась над хатаю лятаў,
На Рэкса голасна брахаў,
Што аж пад гусь схаваўся бык,
Кот у нары мышынай знік.

Шпакоўня ўскочыла ў шпака,
У лес даў певень драпака.
Плот шмыгануў пад куранят,
Хмызняк — у статак парасят.

А Рэкс зашыўся пад страху,
Дрыжэў ад страху ўвесь
Да той пары, пакуль
Карась не сеў за лес.





# Барбарыс для Барыса

СКОРАГАВОРКІ



## ПАДАРУНКІ

Каляровы шар — Ларысе,
Мармелад — сястры Раісе,
Клюшку — брату Бору
Падарылі ў школе ўчора.

* * *

Ларыён, Кірыл, Пракоп — утрох
Прапалолі на градзе гарох.

* * *

Па шумлівай, вірлівай шашы
Трыццаць тры самазвалы прайшлі.

* * *

У гародчыку чаромха расцвіла,
Пчоламі чаромха загула.

* * *

Мяшкі вавёрка восенню пашыла,
Грыбоў, арэхаў, шышак насушыла.

## АРЭХІ

Колькі залатых арэхаў
Мы нарвалі
У бары —
Вам раскажуць
Толькі рэха
І мае сябры.

## ВАРВАРЫНЫ АКУЛЯРЫ

У Варвары — акуляры.
Акуляры да твару Варвары.

## БАНДЭРОЛЬ БАРЫСУ

Бандэроль брат Браніслаў
Барысу з Браслава прыслаў.

## ДОЖДЖ

Зранку цэлы дзень
Дождж на вуліцы ідзе.
Дождж руплівы, палівай! —
Слаўны вырасце ўраджай.

## МЫШКА Ў ШАЛАШЫ

Сенам шапаткім
У шалашы,
Мышка шустрая,
Уночы не шуршы.

## ВЫРАСЦЕ МАТРОСАМ

Брыганціна, тры галеры,
Каравела — у Валеры.
Хлопчык вырасце дарослым,
Пойдзе ў плаванне матросам.



## ДРЭВАЛАЗ

Палікарп, як скалалаз,
Ускараскаўся на вяз.
— Дрэвалаз,— сказаў Алесь,—
Спрытна ты на вяз узлез.

## МЫШКА І МІШКА

Прасіла сыру ў Мішкі
Паўкілаграма Мышка.
А Мішка ў Мышкі
Мядку прасіў паўміскі.

## АРТЫСТЫ

Дрэсіроўшчыкі
Тыграў
Штодзень дрэсіруюць:
Артыстамі тыгры
У цырку працуюць.

## ВАВЁРКА І АРЭХІ

Вавёрка збірала арэхі,
Сабрала арэхаў паўмеха.

* * *

Працаваць я вельмі рад —
Не ідзе адклад на лад.



* * *

Галаваломку разгадвае Ромка,
Толькі няпростая галаваломка.

* * *

Над возерам вецер лятае,
На хвалях лілеі люляе.

* * *

На прагулку ў парк
Прыйшлі Патап і Карп.

* * *

Прыехаў сябар Давыд
Да Эдуарда з Караганды.

* * *

Расцвілі ў бабулі Лёксы
Гладыёлусы і флёксы.

* * *

Тамара малюе кальмара,
А Фрося малюе ласося.

* * *

Сарока вірліва стракоча,
Сказаць штосьці слушнае хоча.

* * *

Забялела грэчка ў полі,
Загулі над грэчкай пчолы.

* * *

Грышка з Колем — карабелы,
Бо майструюць каравелу.

* * *

Вырасцілі Флор і Лора
Боб, фасолю, памідоры.

* * *

У Ларысы і Валеры —
На ліпе арэлі.

* * *

Гравёр на алоўку
Выгравіраваў гравіроўку.

* * *

Прыгожым стол у Палікарпа стаў —
Палікарп стол палакіраваў.

* * *

Урач-ларынголаг
Вылечыў Ігару горла.

* * *

Шуміць ля ракі
Чарот шапаткі.

* * *

Сеў Макарку на твар камарык,
Злавіў камарыка Макарка на твары.

* * *

Просіць Лорка Борку
Выгаварыць скорагаворку.

* * *

Летам Тамара
Гербарый сабрала.

* * *

Караліна Валеру
Падарыла акварэлі,
А Мірастаў Тамары
Падарыў акварыум.

* * *

У сталоўцы Валерка
З'еў бульбы талерку.

* * *

Паўка пакаваў пакупкі
Пакупнікам у пакункі.



# Ехаў поўны воз дзівос

ЗАГАДКІ



* * *

Не спіць удзень,
Працуе ўночы.
То свішча моцна,
То шапоча.
Адчыніць фортку,
Хмары згоніць,
Улетку
Водарам спалоніць.

*(Вецер)*

* * *

За дарогаю на полі
Прыгажун стаіць.
Стройны, сонечны, вясёлы,
Завушніцамі звініць.

*(Авёс)*

* * *

Бацька радасна люляе
Сотні дзетак на руках.
Шапка ў бацькі лісцяная,
Дзеткі ўсе ў капелюшах.

*(Дуб, жалуды)*

* * *

Сам маленькі
І крывенькі,
Важыць грам,
Ды ў рацэ ён
Зловіць плотку
З кілаграм.

*(Кручок)*

* * *

Морам блакітным,
Бяскрайнім,
Жывячы ўсмешкаю свет,
З раніцы
І да змяркання
Ціха царыца плыве.

*(Сонца ў небе)*

* * *

З кожным днём
Таўстун худзее,
Месяц, дзень паведамляе
І прыгадвае падзеі,
А пад новы год —
Знікае.

*(Каляндар)*

* * *

Што за вочы?
Вось дык вочы!
У каго і дзе?
Пазірае адно ўночы,
А другое — ўдзень.

*(Месяц і сонца)*

* * *

Хоць вялікі,
Ды пусты.
Мае голас ён
Густы.
Да таго ж —
Артыст вядомы,
Выбівае дроб
Без стомы.

*(Бубен)*

* * *

Прысеў пад плотам
Рыжы кот,
Павесіў доўгі хвост
На плот.

*(Гарбуз)*

* * *

Хоць без ног,
Але бяжыць.
Без вачэй,
Але глядзіць.

*(Вада)*

* * *

Крылаў не мае,
Ды хутка лятае.
Выпусціш —
Рад ці не рад,
А не зловіш назад.

*(Слова)*

* * *

Работнікаў рупных
Прашу адгадаць:
Адзін з іх гаворыць,
І слухаюць двое,
І двое глядзяць.

*(Язык, вушы, вочы)*

* * *

Малое, круглае,
А трэба —
Яго дакінем мы
Да неба.

*(Вока)*

* * *

Чатыры асілкі —
Чатыры браты.
І кожны —
Аднолькава дуж.
Побач заўсёды яны
І прытым
Носяць адзін капялюш.

*(Стол)*

* * *

Ідуць з хаты —
Вельмі рады.
А калі вяртаюцца —
Слязьмі абліваюцца.

*(Пустыя і поўныя вёдры)*

* * *

Паставіў ён рады салдат,
Нібы павёў іх на парад.
Салдаты ўсе — адна сям'я,
Імёны іх — ад «А» да «Я».

*(Алфавіт)*

* * *

У печы нараджаецца,
А ў неба ён спяшаецца.

*(Дым)*

* * *

Пад зімняй залевай
Стаіць каралевай
У яркіх, агністых,
Прыгожых маністах.
Маніст не шкадуе —
Птушак частуе.

*(Рабіна)*

* * *

Спіць зімою да вясны
Соладка жыхар лясны.
Сніць не снег ён і не лёд,
А духмяны, смачны мёд.

*(Мядзведзь)*

* * *

Чатыры рупныя сястрыцы
Жывуць на свеце.
Назавіце:
Убор зямлі яны мяняюць,
Адна другую век змяняюць.
Хоць сёстры, ды (такая доля)
Ім разам не пабыць ніколі.

*(Поры года)*



* * *

І скача, і спрытна гарцуе,
І рада заўсёды траве.
Хоць носіць цяльняшку марскую,
Ды ў стэпах гарачых жыве.

*(Зебра)*

* * *

Сам не бачыць
Анікога
Ды падкажа ўсім
Дарогу.

*(Компас)*

* * *

Хоць топчуць яе,
І рэжуць, і б'юць —
Яна не злуе анічуць,
А толькі багаццем
Усім шчодра плаціць.

*(Зямля)*

* * *

На сцяблінку
Сонца села.
Белы-белы
Капялюш надзела.

*(Рамонак)*

* * *

У бочачцы чырвонай
Рубінаў поўным-поўна.

*(Гранат)*

* * *

Пачаргова ідуць.
І з далёкіх часоў
Службу часу нясуць
Сем сясцёр і братоў.

*(Дні тыдня)*

* * *

Хоць ляжыць,
Але шчыруе.
Дзень і ноч
Не спіць,
Працуе.

*(Шаша)*



* * *

З-пад снегу выйшла,
Расцвіла,
І так,
Што аж зіма ўцякла.

*(Пралеска)*

* * *

Ходзяць чужымі нагамі,
Мяч адбіваюць насамі.

*(Чаравікі)*

* * *

Што за коннік у сядле? —
Ногі — за вушамі.
Вельмі зоркі ён. Але
Адгадайце самі.

*(Акуляры)*

* * *

Нам патрэбная ў ядзе
Гэта беляніца.
Нарадзілася ў вадзе,
А вады баіцца.

*(Соль)*

* * *

Расце ўніз галавою.
І нараджаецца,
І памірае
Вясною.

*(Ледзяш)*

* * *

Ненажэра гэты з'есці
Можа ўсё на свеце.
А нап'ецца ён вады —
Памірае ўміг тады.

*(Агонь)*

* * *

На катку
На коней стаў,
Хуткай птушкаю
Памчаў.
І мяне
Без гэткіх коней
Аніхто ўжо
Не дагоніць.

*(Канькі)*

* * *

Знаходзіцца дома
У сонечны дзень.
А вось у дажджлівы —
Гуляць ён ідзе.

*(Парасон)*

* * *

Вось дык вочкі!
Што за вочкі? —
Налавілі рыбы
Бочку.

*(Сетка)*

* * *

Гамоніць удзень ён,
І ўночы не спіць ён,
Праводзіць, сустрэне —
Клапотны, гасцінны.

*(Вакзал)*

* * *

Яе ні ўбачыць, ні пачуць
Нідзе, нікому, анічуць.
Яна між вас штодзень бывае,
А загаворыце — знікае.

*(Цішыня)*

* * *

Выспеў на градзе
Белы чарадзей.
Галава — на славу,
Да зубка зубок —
Добрая прыправа,
А завуць...

(Часнок)

* * *

Сакавіты, круглаваты
Здаравяка гэты.
Нам патрэбен на салаты
І на вінегрэты.

(Бурак)

* * *

Выраслі на градцы
Сакаўныя братцы.
Доўгія, шурпатыя,
Вітамінаў шмат у іх.

(Агуркі)

* * *

Вясна яе хавае,
Лета — ажыўляе.
Восень — дастае,
А зіма — прадае.

(Бульба)

* * *

Хвалюе водарам,
Красою,
Але няпроста
Ўзяць рукою.
Галава — пахучая,
Тулава — калючае.

*(Ружа)*

* * *

Гарачае лета,
Спеюць суніцы,
А ён —
У пуховай хусцінцы.

*(Адуванчык)*

* * *

Волата гэтага
Кожны з вас знае.
Кожнае лета ён
Сотні гадоў
Ціха люляе
Сотні сыноў.

*(Дуб, жалуды)*

* * *

Языка не мае,
А крычыць, гукае.
Хоць і гулкае яно,
Ды ніколі не відно.

*(Рэха)*

* * *

Як прывяжаш —
Ён бяжыць.
Як адвяжаш —
Ён стаіць.

*(Тралейбус, трамвай)*

* * *

Не чалавек,
Але працуе,
Іграе, піша,
Рамантуе.
І фрэзероўшчык ён,
І токар,
Здзіўляе ўсіх
Сваёй работай.

*(Робат)*

* * *

Ці не бачылі
Вы дзе
Волата такога:
Рукі, ногі —
У вадзе,
На спіне —
Дарога?

*(Мост)*

* * *

Ці малы я, ці вялікі —
Ды заўсёды ўсё ж мяне
Людзі носяць
На спіне.

*(Рукзак)*

* * *

Вядзе матуля
З двух бакоў
Па лузе ўдалеч
Двух сыноў.

*(Рака, берагі)*

* * *

Калі з яе мы будзем браць,
Яна вялікай зможа стаць.
А многа ёй калі дадзім,
То нават знікне назусім.

*(Ямка)*

* * *

Не ў бары расце — у садзе,
Як маленькі парасон,
Грыб няхітры, вельмі смачны,
З гучнай назвай...

*(Шампіньён)*

* * *

Спусціліся ў лясок
І селі ў верасок
Улетку зоркі-знічкі,
А іх завуць...

*(Лісічкі)*

* * *

Стаіць у шоламе агністым
На ўзлеску воін ганарысты.
Ад мух ахоўвае ён бор,
Завём яго мы...

*(Мухамор)*

* * *

Выраслі ў полі браточкі
І зазванілі ў званочкі:
— Жніце нас і малаціце,
Дзеткам пячэнне рабіце.

*(Авёс)*

* * *

Выспеў каля хаты
Прыгажун вусаты.
Як сажнём, наробім круп,
То згатуем смачны суп.

*(Ячмень)*

* * *

Жаданы госць яна заўсёды
На палетках нашых.
Зацвіце —
Адорыць мёдам.
Адцвіце —
Блінамі, кашай.

*(Грэчка)*

* * *

Сінявокі, слаўны, чысты,
Галаватсы, залацісты.
Дасць абноў ён людзям шмат,
Будзе кожны вельмі рад.

*(Лён)*

* * *

Вечна — беланогая,
Ды сукенку ўсё мяняе:
То яна зялёная,
То празрыста-залатая.
А зімовым ясным днём
Адлівае серабром.

*(Бяроза)*

* * *

І якой дарогай
Ён прыйшоў у бор,
Спелы, беланогі
Дзіўны памідор?

*(Падасінавік)*

* * *

І палянку,
І гушчар,
Любіць грыб,
Не грыб, а цар.
Самавіт ён
І здароў —
Прыгажун
Сярод грыбоў.
Ну, а зварыш
Ці засмажаш,
Што ён вельмі
Смачны — скажаш.

*(Баравік)*

* * *

Па ствалах бярозак
Лазяць,
Не грыбы —
А верхалазы.
І на пнях
Яны растуць.
Адкажы,
Як іх завуць?

*(Апенькі)*

* * *

Сонца весняе
Прыгрэла,
Ажывіла
Дрэвы, травы.
Ля сасны
Забранзавелай
Вырас хлопчык
Кучаравы.

*(Страчок)*

* * *

Капялюшык — строгі,
А камзол — стракаты.
Хоць і аднаногі,
Ды танцор заўзяты.

*(Ваўчок)*

* * *

Хоць без рук яна,
Без ног,
Ды праходзіць
Шмат дарог.

*(Лодка)*

* * *

Праз шкло праходзіць,
Шклу не шкодзіць.

*(Сонечны прамень)*

* * *

У матэматыцы —
Самы галоўны,
Хоць і бывае
Малы і адмоўны.

*(Лік)*

* * *

У сям'і дзяцей сямёра:
Тры сыны,
Дачок — чацвёра.
Імя мае кожны з нас,
Я — малодшая якраз.

*(Надзея)*

* * *

На полі цёмным і бясконцым
Гарох бялюткі зззяе.
А цемру як разгоніць сонца,
Тады гарох знікае.

*(Неба, зоркі)*

* * *

У бацькі —
Дванаццаць
Малойцаў-сыноў,
Адвечных рупліўцаў
І шчырых сяброў.

*(Год і 12 месяцаў)*

* * *

Ходзіць па даху,
Па вуліцы, полі...
Ног у яго —
Не палічыш ніколі.

*(Дождж)*

* * *

Есці век яна не просіць,
Хоць зубоў і многа мае.
Як працуе — сыпле проса,
Весела спявае.

*(Піла)*

* * *

Круглы ён,
Але не мячык.
Ёсць нага,
Але не скача.
Шмат лістоў,
Але не сшытак,
Апрануў
Паўсотні світак.

*(Качан капусты)*

* * *

На повадзе адным вядзе
Ён коней табун па вадзе.

*(Плыт)*

* * *

Без вачэй і без вушэй,
Але водзіць ён людзей.

*(Кій)*

* * *

Паміж дарог драўляных
Уздоўж і ўпоперак ляглі
І моўчкі ўдалеч пазіраюць
Шкляныя роўныя палі.

*(Акно)*



* * *

Больш за дваццаць хлопцаў
Бегаюць услед за мной,
Па чарзе мяне, як хочуць,
Б'юць нагамі, галавой.
А заб'юць — адна палова
Вельмі радуецца ўслых,
А другая — аж гатова
Плакаць горка ў гэты міг.
Ну, а я ляжу, дзіўлюся,
Бо жывым я застаюся.

*(Футбольны мяч)*

* * *

У вадзе яна — сохне,
У агні яна — мокне.
І пакой асвятляе,
І дзядоў памінае.

*(Свечка)*

* * *

Яго дарослы і малы
Хоць сто разоў падымуць
Заўсёды вышай галавы,
Ды і на метр
Не адкінуць.

*(Пух)*

* * *

Хоць на яме
Аж сто ям —
Шыць заўжды
Паможа нам.

*(Напарстак)*

* * *

Хоць і ў чаравіках,
Хай сабе не ў новых,
Ходзяць вельмі спрытна
Хлопцы на галовах.

*(Цвікі ў чаравіках)*

* * *

Каб адзець зімой
Дзесяцярых братоў,
Ім хапіла ўсяго
Толькі двух кажухоў.

*(Рукі і рукавіцы)*

* * *

Па глыбокай вадзе
Хоць бы што ён ідзе.
У агні не гарыць
І на сонцы не вяне.
Пабяжыш — пабяжыць,
Ні на крок не адстане,
Станеш — будзе ляжаць,
А рукой і не ўзяць.

*(Цень)*

* * *

Акрабатка над намі,
Па раўнюткай столі,
Ходзіць дагары нагамі
І не зваліцца ніколі.

*(Муха)*

* * *

Як жа гэта разумець
(Нават у гуморы),
Што піла і меч
Плаваюць у моры?..

*(Піла і меч — рыбы)*

## МАТЭМАТЫЧНАЯ ЗАДАЧА

Задумай лік
І столькі ж
Да яго дадай.

Пасля — на тры
Ты суму гэту
Памнажай.

Затым здабытак
Падзялі
Ты на задуманы
Свой лік.

Цяпер адзінку
Трэба зняць,
І атрымаеш
Роўна пяць.

Калі ты ўмееш
Правільна рашаць,
Што ні задумвай —
Будзе пяць.

## ШАРАДЫ

Разгадаць іх —
Не складана:
Словы ў слова
Тут з'яднаны.

* * *

Мой пачатак —
Роў глыбокі.
Цэнтр —
Лётае ў аблоках.
Мой канчатак
(Кожны знае) —
Меру плошчы
Называе.
А калі мяне
Сабраць —
Я змагу вам
Домам стаць.

*(Яр+АН+га)*

* * *

Першая частка —
Жыве ў акіяне.
Частка другая —
Выклічнікам стане.
А разам
Дзве гэтыя часткі
Складзём —
Краіну
У Азіі
Мы назавём.

*(Кіт+ай)*




* * *

А зараз адмыслова
Мы разгадаем слова:
Народнасці найменне —
Яно трыма складамі,
А першы склад —
Займеннік,
І трэці склад —
Таксама.
А склад другі
Вам у бары
Зязюля выгукне,
Сябры.

*(Я+ку+ты)*

* * *

Да меры плошчы
Зараз, дружа,
Ты літару дадай —
І ў лес лісцёвы
Тут жа
Ідзі адпачывай.

*(Га+й)*

* * *

Калючка расліны
І частка
Кола машыны,
Займеўшы
Трывалую дружбу,
Адразу ўтварылі
Дзікую ружу.

(Шып + шына)

* * *

Займеннік упачатку
Ды і канчатак — ён.
А пасярод — са статка
Прыйшоў маленькі конь.
А разам — назаву я
Краіну астраўную.

(Я + поні + я)

* * *

Прыбудуйце да жылля
Прыназоўнік дбайна,
І пачну металы я
Выплаўляць старанна.

(Дом + на)

* * *

Да меры плошчы
Ноту прыкладзіце —
Імя дзявочае
Мне назавіце.

(Га + ля)



* * *

Калі да стравы крупяной,
Уважліва падумаўшы, дадаць
Прыбор для вымярэння
Глыбіні марской,
Жывёліну марскую
Зможам атрымаць.

*(Каша + лот)*

* * *

Адна — у возеры, рацэ,
Другога мае кожны.
Адна — стаіць,
Плыве, цячэ,
Другі і зрушыцца
Не можа.

А калі ж нам
Іх сабраць —
Чалавекам
Змогуць стаць.

*(Вада + нос)*

* * *

Да голасу
Мужчыны
Калі мы дадамо
Гук пэўнай вышыні,
То гэткім чынам
Танец назавём
Або адну з тканін.

*(Бас + тон)*

* * *

Калі да самалёта
Мы прыставім
Узвышша
З камянёў, пяску,
Тады мы з вамі прыгадаем
Вядомую сібірскую раку.

*(Ан + гара)*

* * *

Першая частка
Сігнал падае,
На рэчцы сустрэнем,
У бухце яе.

Частка другая
Прыйшла з даўніны,
Насып падкажа яна
Земляны.

Першую частку
З'яднаем з другой —
Стануць жывёлінай
Жвачнай буйной.

*(Буй + вал)*

* * *

Вам першаю паловай
Паўстану дрэвам я
Лісцёвым.
А другой —
Ваду згадаю,
Закіпеўшую для чаю.

Увесь —
Падручнік знакаміты,
Усіх знаёмлю
З алфавітам.
У першы клас я
Запрашаю,
Шлях у навуку
Адкрываю.

*(Бук + вар)*

* * *

Да назвы
Істоты міфічнай,
Якая расказвае
Байкі і казкі,
Закрытай пасудзіны
Назву
Цяпер дапішыце,
І вы адгадаеце тут
Без падказкі
Жывёліну стэпаў —
Між іншых звяркоў
Яна прадстаўляе
Атрад грызуноў.

*(Бай + бак)*

## МЕТАГРАМЫ

Літару ў слове,
Адну, памяняем —
Новае слова
Ужо атрымаем.

* * *

У спорце я.
Мяне калісьці
Насілі воіны-стралкі.
А літару адну змяніце —
Кілімам лягу ля ракі.

*(Лук — луг)*

* * *

Высокае дрэва
Паўднёвай краіны,
Я — з гладкаю,
Цвёрдай драўнінай.

Галосную ў слове
Цяпер замяніце —
Жывёлаю стану,
На пашу ганіце.

*(Бук — бык)*

* * *

З «а» — яна вадою
Між лугоў плыве.
З «у» — у нас з табою
І ўва ўсіх — па дзве.

*(Рака — рука)*

* * *

З «р» — жыву я
У вадзе
І патрэбна
У ядзе.

З «ш» — жыву
У кожнай хаце,
У акне
Мяне шукайце.

*(Рыба — шыба)*



* * *

З «к»» — я вадкасці трымаю.
З «с» — я голас называю.
З «л» — пра вецер раскажу
Ці ацэнку пакажу.
З «р» — адразу стану
Невялікім рэстаранам.
З «й» — я казку, байку
Раскажу пра зайку.
З «х» — не пройдзе і хвіліны:
Кампазітар вельмі слынны.

*(Бак — бас — бал — бар — бай — бах)*

* * *

З «м» я — рыба,
З «я» — расліна.
З «к» мяне ўсе
Піць павінны.
З «с» я клічу
Ратаваць,
З «н» прымушу
Моцна спаць.

*(Сом — соя — сок — сос — сон)*

* * *

Буру марскую ў атаку
Зможам мы ператварыць,
Толькі для гэтага варта
Літару ў слове змяніць.

*(Шторм — штурм)*

* * *

Я даўно дружу з усімі,
Бо сама я — твор любімы.
І мяне паўсюль на свеце
Больш за ўсіх чытаюць дзеці.

«З» на «с» я памяняю —
Галаўны ўбор называю,
Можа, і не сімпатычны,
Ды затое — металічны.

*(Казка — каска)*

* * *

Я — у Турцыі,
На карце
Вы сталіцу адшукайце.

А на «г» змяняю «к»
І — сібірская рака.

*(Анкара — Ангара)*

* * *

З «Л» — імя дзяўчыны
І рака таксама.
З «В» — еўрапейскай краіны
Сталіцаю стане.

*(Лена — Вена)*

## АНАГРАМЫ

Словы
Злева, справа прачытаем,
Сэнс заўсёды маем.

* * *

Малочны прадукт,
Ядзім са смакам.
Слова перавернем —
Стане злакам.

*(Сыр — рыс)*

* * *

Адрэзак часу,
Найвядомы,
Наадварот
Як прачытаем,
Сабаку —
Сябра дому —
Адразу атрымаем.

*(Год — дог)*

* * *

Ёсць займеннік,
Ён гатоў
Прачытацца
З двух бакоў.
Ды з другога боку ён
Назаве адно з імён.
То — імя дзяўчынкі,
Адгадайце за хвілінку.

*(Яна — Аня)*



7—84

* * *

Небяспека ў ім —
Усяму жывому.
А калі «працуе» ён —
Шмат навокал грому.

Прачытаць наадварот —
Стане ён прыборам,
Апускаецца за борт
У рацэ і ў моры:
Глыбіні вады замер
З судна робіць ён цяпер.

*(Тол — лот)*

* * *

Я — любімы
Вамі ўсімі,
На трыбуны
Клічу вас.
А заб'юць
Мяне куміры —
Вы шчаслівыя якраз.

Перастáвіць
Вам даволі
З ног мяне
На галаву —
Ні ў хакеі,
Ні ў футболе
Я ўжо болей

Не жыву.
Як акінулі вы
Вокам —
Ярам стаўся я
Шырокім.

*(Гол — лог)*

* * *

Злева прачытаем
Гэтае мы слова
І канат згадаем
Драцяны сталёвы.

Прачытаем справа,
І канат
Катэгорыяй тавараў
Стане акурат.

*(Трос — сорт)*

* * *

Спераду чытаем —
Вал партовы маем.
Ён у мора выступае,
Караблі засцерагае.

Прачытаем ззаду —
Назавём прыладу.
Металічная, здаўна
Прымяняецца яна —
Раскалоць ці раздрабіць,
Штосьці цвёрдае разбіць.

*(Мол — лом)*

* * *

Як мяне вы
Ні чытаеце —
Двойчы з морам
Справу маеце.

Злева —
Судна я марское
І на ветразях плыву.
Справа —
Дзіва я жывое,
Маю клюшні, галаву.

*(Барк — краб)*

* * *

Прачытаем слова злева,
Стане ў свеце прыгажэй,
Бо паўстане каралева
Скквераў і аранжарэй.

Справа позіркам акінем —
Стане лёгкаю тканінай,
Негустым скразным вязаннем,
Ці разьбой, ці вышываннем.

*(Ружа — ажур)*



* * *

З аднаго я боку буду
Збудаваннем
Для рамонту суднаў.

А з другога боку,
Глянь-ка,
Я — сістэма
Умоўных знакаў.

(Док — код)

* * *

Нага ў жывёл
Ці ў птушак
Празрыстым каменем
Нам тут жа
Гатова прагучаць,
Калі яе
Іначай прачытаць.

(Лапа — апал)

* * *

Ён — жаданы і прыемны,
Дасць спачынак нам штораз.
Ну, а слова перавернем —
Ён ва ўсіх на твары ў нас.

(Сон — нос)

* * *

Газеты, часопісы, кнігі —
Усю выдавецкую справу
Калі прачытаеце мігам,
Не злева, вядома,
А справа —
Народа тады прадстаўнік
Прад вамі адразу паўстане.
Жыве той народ-працаўнік
Найбольш у Іраку, Іране...

*(Друк — курд)*

* * *

Тут можна добра адпачыць,
Тут ёсць атракцыёны,
Тут вельмі хораша хадзіць
Усцяж алей зялёных.

Цяпер зірніце на яго,
Перавярнуўшы толькі,
І стане з'яваю другой
Ён — відам расфарбоўкі.

*(Парк — крап)*

* * *

Заўжды ў пераносным
Жыву я значэнні,
Маім моўным лёсам
Заняты пісьменнік.

А справа вы гляньце
На слова ізноў —
І вы на стаянцы
Марскіх караблёў.

*(Троп — порт)*

* * *

Шасціграннік правільны
Зараз пераставім мы
Спосабам звычайным —
Стане дрэвам слаўным.

*(Куб — бук)*

* * *

Гляньце злева —
Я сталіца,
Горад афрыканскі.
Гляньце справа —
Назавіце
Мной
Абоз цыганскі.

*(Рабат — табар)*

* * *

Ён у многіх ёсць —
Дорыць прыгажосць.
У таго, хто мае,
Ён на лоб спадае.

А цяпер яго
Вы перавярніце —
Рыбы ў возеры, рацэ
Летам налавіце.

*(Чуб — буч)*



* * *

Печ кавальскую згадаем,
Потым назву прачытаем
Дагары нагамі —
Атрымаем з вамі
Частку плуга мы, якая
Глебу знізу падразае.

*(Горан — нарог)*

* * *

Калі пасудзіну з лазы
Хто «распляце»
І літары
Па-іншаму складзе —
Бяду-хваробу прачытае,
Якая
Яго ніколі
Хай не напаткае.

*(Кот — ток)*

* * *

Як з гарматы, ён страляе,
З навальніцаю бывае.
І калі перавярнуць,
Не палепшыцца нічуць,
А навеяць нам з табой
Можа толькі горкі боль.

*(Гром — морг)*

* * *

Калі нам грукат,
Шум працяжны
Перакруціць
І прачытаць —
Патрапім мы,
Чытач разважны,
У царства траў
На сенажаць.

(Гул — луг)



## ЗАГАДКІ НА АМОНІМЫ

Мы — словы-блізняты,
Сакрэт наш увесь:
Падобныя знешне,
Ды розны ў нас сэнс.

### АРФЫ

Адна з іх — гарадская,
Вясковая — другая.
Чужыя — хоць блізняты,
Ды ў тым не вінаваты.

Нас музыкай на сцэне
Адна з іх захапляе,
І ад мякіны зерне
Другая ачышчае.

*(Арфа І. Музычны інструмент.
Арфа ІІ. Сельскагаспадарчая машына.)*

## ЗМЯЯ І МІНЕРАЛ

Жыве ў субтропіках і тропіках здаўна
І вельмі небяспечная яна,
Бо ядавітаю з’яўляецца,
Змяёю называецца.

Нам гэта ж слова падказала
Адзін з вядомых мінералаў.

*(Аспід I. Ядавітая змяя.
Аспід II. Уст. Слаісты мінерал
чорнага колеру.)*

## РАСЦЕ АТАВА І Ў АТАВЕ

Кожны год расце адна
На пакошы зноўку.
Для жывёлы корм яна
Добры на зімоўку.

А другая ўжо даўно
Вырасла ў Канадзе.
Можа, бачылі ў кіно
Ці кружком на карце.

*(Атава I. Трава.
Атава II. Горад.)*

## БАБІНЫ

Зерне бабовай расліны,
Толькі адно,
Вы павінны
Зараз, сябры, прыгадаць,

Каб неўзабаве сказаць,
Што і назваць вы
Змаглі так
Шпулю намотаных нітак.

*(Бабіна І. Адно бабовае зерне.*
*Бабіна ІІ. Шпуля з намотанымі ніткамі.)*

## БАЙКУ З БАЙКАЮ НЕ БЛЫТАЙЦЕ

Гавару я адмыслова,
У паэзіі жыву.
Нагадаю вам Крылова
І Кандрата Крапіву.

Апрануць магу таксама,
Прыгажосцю адарыць,
Бо тканінай бавоўнянай
Я з'яўляюся, сябры.

*(Байка І. Літаратурны твор.*
*Байка ІІ. Тканіна.)*

## БАЛОНКА ГЛЯДЗІЦЬ ПРАЗ БАЛОНКУ

Што такое, што такое,
Адгадайце, у пакоі?
То сваволіць пад канапай,
То качае мячык лапай,
Любіць мыцца і купацца,
Любіць з дзецьмі забаўляцца.

І — з акна глядзіць бясконца
Пільным позіркам на сонца,
І на вуліцу, на поле,
І не бегае ніколі.

*(Балонка І. Хатні сабачка.*
*Балонка ІІ. Аконнае шкло, шыба.)*

## ХАДАКІ

Першы — ходзіць у атары
І харчуецца травой.
Кажушок ён кучаравы
Носіць летам і зімой.

А другі — па дошках ходзіць,
І ягоны след відзён.
Ім валодаць не пашкодзіць —
Аздабляе дошкі ён.

*(Баран І. Жывёліна.*
*Баран ІІ. Двухручны рубанак.)*

## БОТ НЕ ЗАМЕНІЦЬ БОТА

Два боты ходзяць па вадзе,
І кожны нас не падвядзе.
Але не можа быць такога,
Каб замяніў адзін другога.

Пра цёзку першага гавораць:
«У дождж не здымеце з нагі».
Калі ж сабраліся вы ў мора,
Патрэбен бот ужо другі.

*(Бот І. Абутак.*
*Бот ІІ. Невялікае судна.)*

## ТАКІЯ РОЗНЫЯ БУХТЫ

Лодкам, яхтам, караблям
Я прытулак добры дам.
А яшчэ — раскіну ўсцяж
На ўзбярэжжы слаўны пляж.

А вось цёзка ўжо мая
Мору нават не радня.
І ў яе такіх турбот —
У адрозненне — няма.
Ды канат, вяроўку, дрот
Скруціць хораша яна.

*(Бухта І. Невялікі марскі заліў.*
*Бухта ІІ. Вялікі скрутак каната, дроту.)*

## ВЯРШКІ

Калісьці папулярным быў,
Надзейна людзям ён служыў,
Бо памагаў у даўніну
Малую мераць даўжыню.

Як і раней, так і сягоння,
Вядомы добра брат ягоны.
У многіх рэчах ён бывае,
Бо верх чагосьці называе.

*(Вяршок І. Старая мера даўжыні — 4,4 см.*
*Вяршок ІІ. Верхняя частка чаго-небудзь; верх, верхавіна.)*

## НЕ З ГАЗУ — ГАЗ

На кухню ён з нетраў
Прыходзіць па трубах.
Лятае ў паветры
І можа быць згубай.

А тут — даспадобы
Дзяўчатам, жанчынам,
Пашыць каб аздобы —
Адорыць тканінай.

*(Газ І. Газападобнае паліва; парападобнае рэчыва.*
*Газ ІІ. Лёгкая шаўковая тканіна.)*

## ЕХАЛІ ГАСЦІНЦЫ ПА ГАСЦІНЦЫ

У нядзелю днём з базару,
На калёсах па гасцінцы,
Дзед прывёз маленькай Вары
Вельмі смачныя гасцінцы.

*(Гасцінец І. Дарога, шлях.*
*Гасцінец ІІ. Ласунак, падарунак.)*

## СЛАЎНЫЯ ГРАНАТЫ

Адзін паспеў на поўдні,
Янтарным сокам поўны.
Набіта ў ім біткам
За сотню больш браткоў.

Другі наш добры госць
Падорыць прыгажосць,
Кулоны і пярсцёнкі
Аздобіць з густам тонкім.

*(Гранат I. Ярка-чырвоны плод.*
*Гранат II. Каштоўны камень.)*

## КАР'ЕРАМ У КАР'ЕР

Я — у скачках і ў яздзе,
Больш мяне няма нідзе.
Не прадмет, а з'ява я —
Самы хуткі бег каня.

А яго — хачу сказаць,
Можам толькі адшукаць
Там, дзе штосьці здабываюць,
Гліну ці пясок капаюць.

*(Кар'ер I. Бег каня.*
*Кар'ер II. Месца здабычы*
*карысных выкапняў.)*

## ДВА КАСАЧЫ

Адзін лятае, а другі
Не ўскіне нават і нагі.
Адзін — над лесам ці балотам,
Другі — на клумбе ці пад плотам.
Адзін — такуе, не спявае,
Другі — прыгожа расцвітае.
А снег глыбокі іх, бывае,
Зімой абодвух саграваае.

*(Касач I. Цецярук-самец.*
*Касач II. Травяністая расліна.)*

## КОНІКІ

Першы возіць сена, дровы,
Цягне плуг, бо ён здаровы.
І на ім алюрам, рыссю
Вельмі хораша прамчышся.

А другі — зусім малеча,
Скача ў травах і стракоча,
Днём яго або пад вечар
Можна ўбачыць, як захочаш.

*(Конік І. Невялікі конь; памянш.-ласк. да конь.
Конік ІІ. Насякомае.)*

## КОРТ КОРТУ НЕ РАЎНЯ

Прадстаўляю двух братоў,
Кожны вам служыць гатоў.
Баваўняны з іх адзін —
Вельмі просты між тканін.

А ягоны брат-блізнец
Дык у тэнісе — вянец.
Без яго нідзе, ані
Не правесці той гульні.

*(Корт І. Тоўстая баваўняная тканіна.
Корт ІІ. Пляцоўка для гульні ў тэніс.)*

## ВЕЛІКАН І КАРЛІК

Назавіце велікана,
На будоўлі ён старанна
Падымае пліты, блокі
І будуе дом высокі.
Без яго і караблі
Разгрузіць мы б не змаглі.

У яго ёсць карлік-брат,
Вартаўнік ён акурат.
І на кухні нам,
І ў ваннай
Ён ваду адкрые дбайна.
Без яго і самавару
Не наліць у кубкі вару.

*(Кран І. Механізм для перамяшчэння грузаў.*
*Кран ІІ. Прыстасаванне для выпускання і перакрыцця вадкасцей, газаў.)*

## КРОНЫ

Нам адна даўно знаёма:
Ёсць і ў лесе, і ля дома.
У спякотны дзень якраз
У цянёк схавае нас.

А ў Еўропе, за мяжой,
Мы сустрэнемся з другой.
Там усё яна купляе,
Хоць сама не спажывае.

*(Крона І. Галінастая частка дрэва.*
*Крона ІІ. Грашовая адзінка.)*

## ЛАЙКА ЛАЙКУ НЕ ПАЧУЕ

Лайка добра цягне санкі,
Лайка — лепшы сябра ў Янкі.
Тая, што на Поўначы жыве,
Працавітаю слыве.

А другая — нежывая,
Ды нявартай не бывае.
І з яе заўжды, дарэчы,
Любім мы і носім рэчы.

*(Лайка І. Парода сабак.*
*Лайка ІІ. Від мяккай скуры.)*

## ДЗВЕ ЛАСКІ

Адна — святло ў душы людзей,
Мы берагчы яе павінны,
Бо з ёю жыць усім цяплей,
А без яе і свет пустынны.

Другая — на лугах жыве,
Узлескі любіць і балоты.
Хоць цела дробнае яе,
Ды кажушок давротны.

*(Ласка І. Пяшчота.*
*Ласка ІІ. Невялікая жывёліна.)*

## ЛІНЕЙКІ

Вам чарціць дапамагае,
Вымярае, вылічае,
Без яе на ўроку
Будзе шмат марокі.

А яе сястра, бывала,
Па дарогах калясіла,
На прыёмы і на балы,
На прагулкі вывазіла.

*(Лінейка I. Планка для вычэрчвання. Вымяральны ці вылічальны прыбор.*
*Лінейка II. Уст. Мнагамесны экіпаж.)*

## ЛІНІ

Аднаго я ў вадаёме
Сеткаю злавіў,
Юшку потым дома
Смачную зварыў.

А вось пазаўчора
Справу меў з другім:
Ветразі я ў моры
Перавязваў ім.

*(Лінь I. Рыба.*
*Лінь II. Моцны тонкі канат.)*

## ЛІРЫ

Я вяла калісьці ў скокі
І нагортвала слязу.
Ды мінуў той час далёкі,
У музеі я ляжу.

А сваячніца — бытуе.
У Мілане, Анкары...
Тым, хто з ёю,— гарантуе
Поўдня розныя дары.

*(Ліра І. Даўнейшы музычны інструмент.*
*Ліра II. Грашовая адзінка ў Італіі і Турцыі.)*

## ЛЯБЁДКІ

Плаваю, лятаю
Хораша я, лоўка,
Лебедзю заўсёды —
Верная сяброўка.

А яна — з металу
І працуе дбала.
Можа нават
Тон за дзвесце
Груз падняць
І перанесці.

*(Лябёдка І. Самка лебедзя.*
*Лябёдка II. Прыстасаванне для падымання і перамяшчэння грузу.)*



## МІНЫ

Калі адну
Пачуем ці пабачым,
Прыдуманую
Толькі падрываць,
То весялосць сваю,
Усмешку страцім
І будзем войны ў свеце
Праклінаць.

А ў гэты самы час
На твары
Другая ўзнікне
З назваю такой.
Яна настроем нашым
Заўладарыць,
Акрэсліўшы выразна
Неспакой.

*(Міна I. Выбуховы снарад.*
*Міна II. Выраз твару.)*

## СЁСТРЫ НОТЫ

Я — з музычнаю натурай,
Я — і знак, і тэкст, і гук.
І заўжды клавіятурай
Вам валодаць памагу.

У мяне ёсць (вось загадка!)
Афіцыйная сястра,
Па натуры — дыпламатка,
Бо яе прымае ўрад.

*(Нота І. У музыцы.*
*Нота ІІ. Дыпламатычны зварот.)*

## ПАДАРОЖНІК НА ПАДАРОЖНІКУ

У дарозе ён заўсёды,
Ходзіць, ездзіць і лятае,
Гарады, людзей, прыроду —
Свет вакольны вывучае.

Ну, а ён — узбоч дарогі
Ці каля сцяжыны
Нам трапляецца пад ногі
Некрыклівая раслінай.

*(Падарожнік І. Вандроўнік.*
*Падарожнік ІІ. Расліна — трыпутнік.)*

## ПАК І ПАК

Ён даступны ўсім, дарэчы,
І яго мы назавём,
Дакументы, кнігі, рэчы
Як увяжам ці складзём.

А любой часінай года
Мерзне ўжо не год, а шмат
У палярных золкіх водах
Ледзяны ягоны брат.

*(Пак І. Стос, вязка прадметаў.*
*Пак ІІ. Шматгадовы лёд у*
*палярных водах.)*

## НА ПАЧАТАК — ПАЧАТАК

Што ні пачынаецца —
Мною называецца.
Я на месца
І на час
Вам указваю якраз.

А вось ён —
Падкажа плод.
Па яго на агарод,
Як паспее,
Загляніце —
З кукурузы
Адарвіце.

*(Пачатак І. Месца, пункт, момант,*
*з якога што-небудзь пачынаецца.*
*Пачатак ІІ. Плод кукурузы*
*або іншай расліны.)*

## ДВА ПОЎДНІ

Хоць блізняты — знешне,
З іменем адным,
Ды нутром, канешне,
Розныя яны.

Першы з іх — дарогу
Ў цёплы край вядзе,
А сустрэць другога
Дапаможа дзень.

*(Поўдзень І. Напрамак свету.*
*Поўдзень ІІ. Сярэдзіна дня.)*

## НА ПОЎНАЧЫ — ПОЎНАЧ

Аніякіх тут дзівос,
Таямніц няма, паверце.
Буду я, была і ёсць,
Нас чатыры ўсіх на свеце.

А яна заўсёды ў нас
Уначы бывае,
Нам сярэдзіну якраз
Ночы называе.

*(Поўнач I. Напрамак свету.*
*Поўнач II. Сярэдзіна ночы.)*

## РАКУ РАК — НЕ СВАЯК

Гэты хораша вядомы
I на ўвесь, напэўна, свет.
Ён у рэчцы, вадаёме,
Ды і ў возеры жыве.

Ну, а з гэтым
Лепш не знацца
Анікому, анідзе,
А надарыцца спаткацца —
Быць хваробе і бядзе.

*(Рак I. Прэснаводная жывёліна.*
*Рак II. Злаякасная пухліна.)*

## РАЦЫЯ Ў РАЦЫІ

Я магу без паштальёна,
Без ганца,
Без тэлефона,
З кім захочаце, звязаць,
Весткі хутка перадаць.

Ды і я дружу са словам,
Бо ў выказванні —
Аснова,
Ці падстава я і сэнс,
Вось вам мой сакрэт —
Увесь.

*(Рацыя І. Перастаўная ці пераносная радыёстанцыя.
Рацыя ІІ. Аснова думкі, выказвання; сэнс.)*

## РЫССЮ АД РЫСІ

Не прадмет, і не жывёла,
І не рыба — з'ява я.
Называю адмыслова
Шпаркі, хуткі бег каня.

А яна — у лесе, пушчы,
У тайзе жыве здавён.
Толькі шышак вось не лушчыць —
Нападае на жывёл.

*(Рысь І. Хуткі алюр.
Рысь ІІ. Драпежная жывёліна.)*

## САГА ПРА САГУ

Пра геройскае змаганне
Скандынаваў ці ірландцаў
Я народнае паданне
Вам паведаю дарадцам.

Крупамі тут проста
Я цяпер паўстала,
Ні аўсом, ні просам —
Крупамі з крухмалу.

*(Сага I. Старажытнае сказанне.*
*Сага II. Крупы з крухмалу*
*сагавай пальмы.)*

## САКІ

Я жанчыне век служу.
У халаднаваты дзень
Клапатліва ёй кажу:
Сёння ты мяне адзень.

А вірласты мой сабрат
Парыбачыць вельмі рад.
Лезе ў сажалку, раку,
Верна служыць рыбаку.

*(Сак I. Жаночая вопратка.*
*Сак II. Рыбалоўная снасць.)*

## СЕНА НА СЕНЕ

Адно жывёле будзе ежай
Зімой на ферме ці ў хляве.

Другая ў горадзе замежным
Спакойнай рэчкаю плыве.

*(Сена I. Скошаная і высушаная трава.*
*Сена II. Рака ў Францыі.)*

## ТРЫ СОЛІ

Нараджаецца ў вадзе,
Нам патрэбная ў ядзе.

Ёсць і ў музыцы таксама —
Пяты гук музычнай гамы.

Іх у меру вы ўжывайце,
Імі вы не злоўжывайце,
Бо, сябры мае, інакш
За настрой баюся ваш.

І яшчэ ёсць соль адна,
Пры грашах была яна.
Бачыў я яе ў Перý,
Верце, праўду гавару.

*(Соль I. Сталовая соль.*
*Соль II. Нота.*
*Соль III. Былая грашовая адзінка Перу.)*

## СОН ПРА СОН

Ён прыйшоў уночы
І закрыў мне вочы.
І, на крылах бы, панёс
У краіну ўсіх дзівос.

На палянчцы лясной
Паказаў мне ўлетку
І назваў сабой
Прыгажуню-кветку.

*(Сон І. Стан спакою; тое, што сніцца.*
*Сон ІІ. Травяністая расліна.)*

## ТАКСА НА ТАКСУ

Мне расцэнкаю варта
На тавары назвацца,
Ці размерам аплаты
За паслугі і працу.

Тут — расцэнак ніякіх,
Тут няма плацяжу,
Тут я назву сабакі
Вам, сябры, падкажу.

*(Такса І. Дакладная расцэнка тавараў; размер аплаты працы і паслуг.*
*Такса ІІ. Невялікі гладкашэрсны сабака.)*

## ТАНКІ

Я — машына баявая,
Да таго ж — і бранявая.
У вайну з вялікай славай
За свабоду ваявала.

А вось я — цывільны,
Па натуры — мірны.
Вадкасці трымаю,
Многа наліваю.

*(Танк І. Баявая бронемашына.
Танк ІІ. Бак, цыстэрна.)*

## ТУМАНЫ

Аднаго мы добра знаем:
На лугі пад вечар
Белай воўнай выпаўзае
Ён з густой сінечы.

Нумізматаў мы папросім
Пазнаёміць нас з другім,
У Іране ён калісьці
Быў не простым —
Залатым.

*(Туман І. Прыродная з'ява.
Туман ІІ. Іранская залатая
манета.)*

## ТРЫ ТУШЫ

З першым
На вакзале
Мы апоўдні сёння

Радасна віталі
Сябра-чэмпіёна.

А з другою,
Чорнай,
Вадкай, як чарніла,
Мы чарцёж учора
Хораша чарцілі.

А калі з Аркадзем
Першы раз гулялі
Ў клубе на більярдзе —
Трэцяга спаткалі.

*(Туш І. Кароткае музычнае прывітанне.*
*Туш ІІ. Фарба.*
*Туш ІІІ. Выпадковы дотык да шара ў гульні на більярдзе.)*

## ФЕРМЫ

Гаспадаркай тут я буду,
Вам сустрэнуся я ўсюды,
Дзе вырошчваюць кароў,
Птушак, коней і звяркоў.

Ну, а тут я —
Частка моста,
Адшукаць мяне вам проста,
Нават без інструкцыі,
Я — імя канструкцыі.

*(Ферма І. Гаспадарчае прадпрыемства.*
*Ферма ІІ. Канструкцыя з металічных ці драўляных брусоў.)*

## ХАРЭІ

Тут — я рытмам апантаны,
Бо ў паэзіі жыву.
Я памер вам вершаваны,
Двухскладовы, назаву.

Тут — на Поўначы я снежнай
І дапамагчы мастак
Кіраваць усім запрэжкай
І аленяў, і сабак.

*(Харэй І. Вершаваны памер.
Харэй ІІ. Доўгі шост.)*

## ШАШКІ

Слынная дама
У спорце — адна,
Ходзіць па клетках
Заўсёды яна.

Лютай калісьці
Другая была.
З бітвы ў музеі
Даўно перайшла.

*(Шашка І. Кружок для гульні ў шашкі.
Шашка ІІ. Халодная зброя.)*

## ЮШКІ

У вясковай хаце
Вы яе шукайце.
Металічная яна,
Круглая і чорная,
І адразу не відна,
Бо сядзіць
У коміне.

А цяпер —
Яна ўжо страва.
Ну, а каб яе зварыць,
Свежай рыбы
І прыправы
Неабходна раздабыць.

*(Юшка І. Металічны кружок, якім закладаюць адтуліну ў коміне.
Юшка ІІ. Страва.)*

# ЗАГАДКІ НА АНТОНІМЫ

Вам загадкі зноў,
Ды на пары слоў.
Іх сакрэт увесь —
Прощілеглы сэнс.



* * *

Вабіць нас яно заўжды
Ягадамі, жытам,
Звонкай свежасцю вады,
Сонечным блакітам.

А яна палоніць сном
Луг, і сад, і поле,
Пакрывае рэчку льдом,
Снегам — наваколле.

*(Лета — зіма)*

9—84

* * *

Тут — Радзіма,
Кут адзіны,
Самы родны
На ўвесь свет,
Тыя любыя мясціны,
Дзе з'явіўся ты
На свет.

Тут —
Нядродная краіна,
Незнаёмы,
Новы край.
Ну, а лёс
Сюды закіне —
Нібы родны,
Паважай.

*(Бацькаўшчына — чужына)*

* * *

Адзін — і сее, і будуе,
Гатуе, возіць, рамантуе,
Працуе рупна, без прынукі
І мае залатыя рукі.

Другі — няўмелы і няўдалы,
І абыякавы, і вялы.
Яго не радуе работа,
Бо ім валодае лянота.

*(Працаўнік — гультай)*

* * *

Напаткаць яно
Павінна
Тых, хто ўчыніць
Зло, правіннасць.

А яна вось —
Дар ці плата
Тым, працуе хто
Заўзята.

*(Пакаранне — узнагарода)*

* * *

Усё жыццё
Адна другому
Яны — загадкамі заўжды.
На ёй —
Жыць хораша жывому,
Ёсць нівы, рэкі, гарады.

А ў ім —
Аблокі, сонца, зоры
І безліч розных таямніц.

Яно — блакітны гмах высокі,
Яна — прад намі век ляжыць.

*(Зямля — неба)*

* * *

Адзін — вясёлы, поўны сілы,
На плён і шчасце спадзяецца.
Штодзень, нібы на крылах,
Да мары ўпэўнена імкнецца.

Другі — разгублены, маркотны,
Нікому ўжо не давярае,
Жыве, працуе без ахвоты,
Усё бяздумна асуджае.

*(Аптыміст — песіміст)*

* * *

Называецца напрамкам,
Выпускае сонца
Ранкам.

І напрамак тут
Таксама,
Сонца —
Госць тут
Вечарамі.

*(Усход — захад)*

* * *

Тут я — хлопец малады,
Не зважаю на гады,
Я вясёлы і здаровы,
У жыццёвы шлях гатовы.

Ну, а ён
Пражыў нямала,
За яго плячыма —
Сталасць.

У яго
На схіле год
Са здароўем
Шмат турбот.
Нам яго,
Хачу дадаць,
Трэба, дзеці,
Шанаваць.

*(Юнак — дзед)*

* * *

Яны — варожыя заўсёды,
І не жадайце іх мірыць,
Бо не патрэбна іхняй згоды,
Яе не можа нават быць.

Няхай адна перамагае —
Святая, светлая штораз,
Прамая, шчырая, якая
Красою напаўняе нас.

*(Праўда — хлусня)*

* * *

Адгадаць зноў
Прапаную
Процілеглых
Пару слоў,
З іх адно —
Прадмет,
Ці рэч, якую

Нехта некалі
Знайшоў.
А другое з іх
Падкажа
Ці прадмет,
Ці рэч — прапажу.

*(Знаходка — страта)*



* * *

Яно квітнее і вірыць,
Яно працуе і спявае,
І больш каштоўным за яго,
Сябры,
Нічога ў свеце не бывае.

А гэта — гібельны прысуд
Яму выносіць, касцяная,
І для кагосьці там ці тут
Яго навек яна спыняе.

*(Жыццё — смерць)*

* * *

Брат, празрысты, светлы,
Працаваць нас кліча.
Запрашае ветла
Спаць сястра-чарніца.

Ім абоім, верце,
(Не па іхняй волі)
Разам не сустрэцца,
Не пабыць ніколі.

*(Дзень — ноч)*

* * *

Што сабраць нас
Нельга разам —
Тут няма сакрэту,
Бо мы розныя падкажам
Вам напрамкі свету.

З нас адзін —
Заўжды лагодны,
Цёплы, санцавейны,
А другі —
Часцей халодны,
Ледзяны, завейны.

*(Поўдзень — поўнач)*

* * *

Адны — раней
Жывуць, ствараюць
І пра другіх
Заўсёды дбаюць.
І даючы другім жыццё,
Сыходзяць самі ў небыццё.
Між імі
Сувязь ёсць жывая.
Другія —
Першых прадаўжаюць.

*(Продкі — нашчадкі)*

* * *

Без яго жыццё — самота,
Ён — надзея, і пяшчота,
І памочнік ён, і брат,
Хай у нас іх будзе шмат.

А ягоны антыпод
Прынясе нам шмат нягод.
Будзем моцна сябраваць,
Каб яго не сустракаць.

*(Сябар — вораг)*

* * *

Адзін — высокі і магутны,
Сапраўдны велікан, асілак.
Або паміж людзей славуты
Сваёй душы чароўнай сілай.

Другі — маленькі, невысокі,
З аршын ён ростам будзе, пэўна.
Ці ў нейкай справе недалёкі,
Нікчэмны нават і мізэрны.

*(Гігант — пігмей)*

* * *

Ён патрэбен нам усім
Дзеля працы, шчасця.
Мы заўсёды разам з ім
Будзем усміхацца.

А яна — бяда і зло,
Мора слёз і болю,
І яе — каб не было
Анідзе, ніколі!

*(Мір — вайна)*

* * *

Адно — і шчырасць, і спагада.
Багацце, прыгажосць — у ім.
У сэрцы і ў штодзённых справах
Яго патрэбна несці ўсім.

Другое — слёзы і нягоды.
Злачынства, шкода і хлусня.
Змагацца трэба з ім заўсёды,
Каб радасць поўніла штодня.

*(Дабро — зло)*

* * *

Я настрой усім ствараю
І здароўе паляпшаю.
Радасць, весялосць, удачу
Шчыра, гучна абазначу.

А вось ён бываць ахвочы
Там, дзе боль, бяда і скруха.
Ён слязамі поўніць вочы,
І яго балюча слухаць.

(Смех — плач)

* * *

Адна — прыроду ажыўляе,
У квецень дрэвы апранае
І з поўдня цёплага дамоў
Вяртае ластавак, буслоў...

Другая — ураджай збірае
І хутка дрэвы распранае.
Крылатых рупных жыхароў
На поўдзень адсылае зноў.

(Вясна — восень)

* * *

Сястра нараджаецца ўночы,
Ласкавая, ціхая, крочыць
Насустрач чарговаму дню
І свет абуджае ад сну.

А брат нараджаецца днём,
Усіх зачароўвае сном.
Запальвае зорку за зоркай
І ўночы знікае глыбокай.

*(Раніца — вечар)*

* * *

Адна — кагосьці сустракае,
Часцей прыемнаю бывае.
Яе заўсёды прызначаюць,
Яе з надзеямі чакаюць.

Другая — сумнаю і горкай,
Кароткай, доўгаю бывае.
Адно яна і робіць толькі,
Што ўсіх на свеце разлучае.

*(Сустрэча — разлука)*

* * *

Першую прыносяць талент,
Працавітасць, прыгажосць,
Мы заўжды яе вітаем,
Рады, што яна ў нас ёсць.

А другую выклікаюць
Здрада, ленасць і хлусня,
Хай заўсёды абмінае
Нас усё жыццё яна.

*(Слава — ганьба)*

* * *

Абедзве часта нас даймаюць,
Шукаць ратунку прымушаюць.
Адна з іх летам узнікае,
Штораз купацца заклікае.
Калі яна мацнее ўдзень,
Імкнемся мы схавацца ў цень.

Другая — холадам сцюдзёным
Зімой завітвае да нас.
Пад стрэхі вераб'ёў заганіць,
Дыханнем ледзяным абдасць.

*(Спёка — сцюжа)*

* * *

Адна — праз барацьбу і веру
З нястачы, ланцугоў, нягод
Да незалежнасці наперад
Вядзе няскораны народ.

Другая — сее горыч, страты
(Няхай навек яна згарыць),
Бо праўду кідае за краты,
Хаця, вядома, да пары.

*(Свабода — няволя)*

* * *

Не зраблю вам адкрыцця,
Я — здарэнне, выпадак з жыцця.
Я — гісторыя на яве,
Я была на самай справе.

А яна — наадварот.
Бо фантазій розных плод,
Нерэальнае паданне,
Выдумка-апавяданне.

*(Быль — небыліца)*

* * *

Яна — маўклівая, нямая,
Безабаронная такая.
Калі патрэбна адпачыць,
Яна павінна побач быць.

А ён як з'явіцца, цягучы,
Нястрымны, гулкі ці пявучы,
То, безгалосая, якраз
Яна пакіне ўмомант нас.

*(Цішыня — шум)*

* * *

Прамяніста-залатое
Дзіва гэтае зямное.
Дорыць сонца нам яго,
Ясна-ясна з ім — кругом.

А як толькі промні сонца
Дагараць на гарызонце,
Цёмнай хусткаю цыганка
Ахіне зямлю да ранку.

*(Святло — цемра)*

* * *

Ствараюць адвеку
Настрой чалавеку —
То светлы, узнёслы,
Вясновы, дзівосны.

То змрочны, самотны,
Жахлівы, маркотны.
І поруч заўсёды,
Хаця — антыподы.

*(Радасць — гора)*





# ЗМЕСТ


У РОДНЫМ КРАІ

*(вершы)*

Скарына — 4
Малюнак — 5
Я прыеду — 6
Матчына любоў — 7
Помнік герою — 8
Матуля — 9
Дамок для Рэкса — 10
Казкі — 11
У выхадны — 11
Мой буслік — 12
Радзіма — 12
У заапарку — 13
Паўлін — 13
Насарог — 13
Вярблюд — 14
Бягун — 15
Хітры ткач — 15
Галка і галчаняты — 15
Ліса і курачка — 16
Лянівы ёрш — 18
Зязюля — 19
Жарабя — 19
Хваравіты Янот — 20
У магазіне — 21
Дазор — 21
Грэх — 22
Тырады — 22
Пра пракосы і пра косы — 22
Выхвалякі — 23
Хто што або дзе і чым запраўляе — 23
Пра імёны — 24
Кот і мышка — 26
Мароз — 27
Снегавік — 28
Завіруха — 29
Прадвесне — 29
Красавіцкі дзень — 30
Што здарылася? — 30
Ландыш — 31
Пасадзілі сад — 32
Шкадлівая Мурка — 32
Родны кут — 34
Ірынка — 34
Пліска — 35
Шыпшына — 35
Бяроза — 36
Травы — 36
Колькі кветак? — 37
Града — 38
У вёсцы — 39
Сенакосная пара — 39
Сны з маленства — 40
Лепшы грыбнік — 41
Адкрыццё — 41

Кліча сад — 42
Запрашаю — 42
Лясная працаўніца — 43
Журавы — 43
Птушынае свята — 44

КУРАНЯТ ВЯДЗЕ АВЕЧКА
*(смяшынкі, лічылкі, небыліцы)*

Жэня і кішэня — 46
Востры язык — 46
Што на носе? — 47
Што гарыць? — 47
Ці знойдзе? — 47
Перастрахаваўся — 48
Ля карты — 48
Прычына — 48
Страшны дзённік — 49
Ведае кот — 49
Каб не пастарэць — 49
Вясновы дзень — 50
У грыбах — 50
Шчодры пеўнік — 51
Лісіны грабянёк — 52
Працалюбы — 52
Канцэрт — 53
Куранят вядзе авечка — 54
Бывае ж такое! — 54
Перапалох — 54

БАРБАРЫС ДЛЯ БАРЫСА
*(скорагаворкі)*

ЕХАЎ ПОЎНЫ ВОЗ ДЗІВОС
*(загадкі)*

Шарады — 86
Метаграмы — 92
Анаграмы — 96
Загадкі на амонімы — 105
Загадкі на антонімы —129

**Пазнякоў М. П.**

П 47 Ехаў поўны воз дзівос: Вершы, смяшынкі, лічылкі, небыліцы, скорагаворкі, загадкі: Для малод. шк. узросту / Маст. В. А. Макаранка.— Мн.: Юнацтва, 1994.— 143 с.: іл.

ISBN 5-7880-0878-6.

Поздняков М. Ехал полный воз чудес.

Новая кніга паэта складаецца з некалькіх раздзелаў. У першым прадстаўлены вершы на самыя разнастайныя тэмы нашай рэчаіснасці. У другім раздзеле — смяшынкі, лічылкі, небыліцы. Трэці раздзел склалі скорагаворкі. Вельмі зацікавіць юных чытачоў і чацвёрты раздзел кнігі. Тут сабраны загадкі.

**4803120205— 069**
**П ——————— 70—93**
**М 307(03)—94**

**БКК 84 Бел 7**

Литературно-художественное издание

**ПОЗДНЯКОВ Михаил Павлович**

**ЕХАЛ**
**ПОЛНЫЙ ВОЗ**
**ЧУДЕС**

**Стихи, смешинки, считалки, небылицы, скороговорки, загадки**

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**ПАЗНЯКОЎ Міхась Паўлавіч**

**ЕХАЎ**
**ПОЎНЫ ВОЗ**
**ДЗІВОС**

**Вершы, смяшынкі, лічылкі, небыліцы, скорагаворкі, загадкі**

Рэдактар *У. М.-Мазго*
Мастацкі рэдактар *У. М. Жук*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*
Карэктар *Л. К. Паплаўская*

ІБ № 1881

Здадзена ў набор 19.02.93. Падпісана да друку 06.08.93. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$. Папера кн.-журн. Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9,0. Ум. фарб.-адб. 36,5. Ул.-выд. арк. 8,08. Тыраж 20 000 экз. Зак. 84.

Выдавецтва «Юнацтва» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 7. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

